духавых інструментаў, пачалося станаўленне новай выканальніцкай школы, паколькі старая была страчана ў сярэдзіне XX ст. Сёння праблема стабільнага забеспячэння інструментамі, на жаль, не вырашана, як і не пабудавана «па вертыкалі» сістэма навучання на гэтых інструментах (пачынаючы са школы і заканчваючы ВНУ). Апошняе адмоўна сказваецца на станаўленні выканальніцкай школы на беларускіх народных духавых інструментах, на прафесійным узроўні выканаўцаў. Назіраюцца праблемы і з рэпертуарам. Пры гэтым роля тых жа дудкі, жалейкі, дуды і акарыны ў сучаснай народна-інструментальнай практыцы звычайна зводзіцца толькі да надання пэўнага каларыту, мастацкай прыгажосці. Пераважная большасць кіраўнікоў ансамбляў не разглядае гэтыя інструменты як самастойныя з прычыны няведання іх тэхнічных і мастацкіх магчымасцяў. У сваю чаргу, практыка паказвае, што тэмбр беларускіх духавых інструментаў уплывае на характар выкананага твора, на перадачу зместу той ці іншай песні, дапамагае падчас спеваў. Галасы народных інструментаў служаць сродкам, які можа суцешыць чалавека, выклікаць добрыя пачуцці, дапамагчы ў паўсядзённым жыцці.

Спіс літаратуры:


1. Беларускі фальклор : энцыклапедыя. У 2 т. Т.1. А-К / гал. рэд. Г.П. Пашкоў. – Мінск : Бел. энцыкл., 2005. – 768 с.
2. Беларускі фальклор : энцыклапедыя. У 2 т. Т.2. Л-Я / гал. рэд. Г.П. Пашкоў. – Мінск : Бел. энцыкл., 2006. – 832 с.
3. Гром, У. М. Заіграйце, музыкі! : Рэперт. зб. для фальклор. калектываў : у 2 ч. – Мінск : Чатыры чвэрці, 1998. – Ч.1. – 111 с.
4. Гром, У.М. Заіграйце, музыкі! : Рэперт. зб. для фальклор. калектываў : у 2 ч. – Мінск : Чатыры чвэрці, 1998. – Ч.2. – 155 с.
5. Гром, У.М. Школа іграы на беларускіх народных духавых інструментах : вучэб.-метад. дапам. / У.М. Гром, А.Я. Крамко, І.А. Мангушаў. – Мінск : Бел.дзярж.ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – Ч. 1. Сольнае выкананне. – 259 с.
6. Гром, У.М. Школа іграы на беларускіх народных духавых інструментах : вучэб.-метад. дапам. / У.М. Гром, А.Я. Крамко, І.А. Мангушаў. – Мінск : Бел.дзярж.ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – Ч. 2. Ансамблевае выкананне. – 217 с.
7. Карацееў, А.Л. Неардынарная з'ява нацыянальна-выканальніцкага адраджэння / А.Л. Карацееў // Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў. – 2005. – № 5. – С. 119–122.
8. Крамко, А.Я. Беларускія народныя духавыя інструменты: вучэбны дапаможнік / А.Я. Крамко. – Мінск: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – 34 с.
9. Назіна, І.Д. Беларускія народныя музычныя інструменты / І.Д. Назіна – Мінск : Беларусь, 1997. – 239 с.
10. Ярук, С.П. Белорусская дудка в национальной музыкальной культуре (на примере изучения и освоения художественно-исполнительских возможностей народного инструмента) / С.П. Ярук // Научные исследования и их практическое применение. Современное состояние и пути развития : сб. науч. тр. по материалам междунар. научн.-практ. конф. – Одесса : Черноморье, 2007. – История, геология, государственное управление, искусствоведение и архитектура, туризм и рекреация, физическое воспитание и спорт. – С.66 – 71.
11. Гурт «Стары Ольса» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://www.staryolsa.com. – Дата доступа : 21. 02. 2008.
12. Гурт «Палац» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http:// www.palac.org. – Дата доступа : 25. 03. 2008.
13. Гурт «Троіца» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http:// www.troitsa.net. – Дата доступа : 16. 04. 2008.
14. Гурт «Ветах» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http:// www.vietah.narod.ru. – Дата доступа : 21. 04. 2008.



***Святлана Кананові́ч***


## ЭТНАКУЛЬТУРНАЕ ВЫХАВАННЕ Ў МУЗЕІ ЯК АДЗІН З СРОДКАЎ РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

Пытанні захавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны набываюць асаблівае значэнне ў сувязі з абвастрэннем сацыяльна-культурных праблем (праблем адукацыі, маралі і выхавання), якія ў стане вырашыць менавіта спадчынная, аксіялагічная, найбольш каштоўная частка традыцыйнай культуры. Яна захавала і зберагла ў сабе найбагацейшы выхаваўчы вопыт, які назапасіўся за ўвесь час існавання беларускага этнасу. Апошняе паслядоўна і рознабакова выкладзена ў працах даследчыкаў Л. Гумілёва, С. Болбаса, В. Калацэя, Н. Матыліцкай, М. Козенкі і інш.

Дзейнасць, што спрыяе трансляцыі фальклорнай традыцыі ў грамадстве, мае прававую падтрымку на дзяржаўным і міжнародным узроўнях: «Рэкамендацыі пра захаванне фальклору» UNESCO (рэзалюцыя прынята на 32-м пасяджэнні 15 лістапада 1989 г.); «Праграма дзяржаўнай падтрымкі традыцыйнай культуры» Рэспублікі Беларусь на 1994–1996 гады, рэалізацыя пэўных палажэнняў якой працягваецца; дзяржаўныя навукова-тэхнічныя праграмы «Культура» (1997), галіновая навукова-тэхнічная праграма «Захаванне і развіццё культуры ў Рэспубліцы Беларусь да 2010 г.»; пэўныя раздзелы закона «Аб

культуры» Рэспублікі Беларусь і інш. [1, глава № 6]. Аб'ектыўна, што механізм, які сёння распрацоўваецца, датычыццаператварэння стратэгіі ў практыку. Асабліва плённым сёння нам бачыцца ўзаемадзеянне нацыянальных мастацкіх цэнтраў, устаноў культуры і адукацыі, клубаў гістарычнай рэканструкцыі, творчых калектываў з музеямі Беларусі. Сярод апошніх актуальным стала не толькі захаванне фальклорна-этнаграфічных экспанатаў у фондах, але і іх плённае выкарыстанне ў экспазіцыі, у стварэнні канцэптуальна новай стратэгіі дзейнасці беларускіх музеяў. Што выкладзена ў навуковых артыкулах даследчыкаў А. Вароніна, Б. Жыльмана, А. Калбаскі.

У сувязі з мэтай артыкула – раскрыццём патэнцыяльных магчымасцей музеяў Беларусі ў рэпрэзентацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны і этнакультурным выхаванні дзяцей і моладзі – былі сфармуляваны пэўныя задачы.

1. Вызначыць, якую ролю выконваюць музеі сярод шэрагу дзяржаўных устаноў культуры і адукацыі ў галіне захавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі і этнакультурнага выхавання.
2. Абазначыць магчымыя шляхі ўзаемадзеяння музеяў з іншымі дзяржаўнымі ўстановамі культуры і адукацыі для стварэння агульнай культурна-адукацыйнай прасторы.

Хваля зацікаўленасці культурнай спадчынай Беларусі не абмінула і музеі. «Жывое» аднаўленне традыцыі на чарзе з іншымі дзяржаўнымі ўстановамі культуры падтрымалі музеі Беларусі. Так, да прыкладу, супрацоўнікамі Гісторыка-культурнага запаведніка «Заслаўе» была распрацавана наватарская ідэя рэкантруяваць пяць розных абрадаў Купалля. Арганізацыю і правядзенне абрадавых святаў узяў на сябе спеўны гурт «Заслаўскія летуценнікі». А ў траўні 1987 года была наладжана адмысловая экспедыцыя, скіраваная на вывучэнне фальклорных традыцый. Новы калектыў музея мэтанакіравана стаў працаваць над ідэяй стварэння «экамузея» [3, с. 50]. Тым больш, што перадумовы развіцця такога музея ўжо былі вызначаны ў Еўропе ў якасці новых тэндэнцый ў музейнай сферы. Што было абумоўлена павялічаным інтарэсам да народнай культуры і памкненнем захаваць культурную самабытнасць. Пачало замацоўвацца ўяўленне аб тым, што варта захоўваць і паказваць не толькі асобныя культурныя помнікі, але і іх функцыянальныя сувязі з іншымі аб'ектамі, што ўзнікла неабходнасць аднаўляць увесь той цэласны асяродак, які фарміруецца разнастайнымі па ступені значнасці аб'ектамі. Нацыянальная свядомасць еўрапейцаў мела адным са сваіх вынікаў з'яўленне і наступнае павелічэнне колькасці нацыянальных музеяў, якія змяшчалі ў сваіх фондах асабліва каштоўныя калекцыі помнікаў агульнанацыянальнага значэння. Не выключэннем быў і Гісторыка-культурны запаведнік «Заслаўе». Новы калектыў музея стаў мэтанакіравана ўкараняць ідэю экамузея, як «школы», якая далучае мясцовых жыхароў да дзейнасці, скіраванай на вывучэнне і ахову фальклорнай спадчыны беларусаў. Новай тэндэнцыяй у развіцці музейнай справы, на наш погляд, павінна стаць узаемадзеянне музея і ўстаноў культуры і адукацыі на шляху стварэння адзінай адукацыйна-выхаваўчай прасторы. Дзе выхаванне падрастаючага пакалення вялося б сродкамі традыцыйнай культуры беларусаў. Што заканамерна, бо музей паступова пераўтварыўся ў неад'емную частку паўсядзённага жыцця чалавека. І ў межах яго новых магчымасцей варта было б стварыць музей новага тыпу, у якім не толькі б захоўваліся і экспанаваліся калекцыі вартасных для культурнага жыцця краіны рэчаў, але і ажыццяўляўся пры іх дапамозе шэраг іншых функцый. Што ў сваю чаргу з'яўляецца надзвычай актуальным у сучаснай сістэме музейнай дзейнасці. Другімі словамі, музей сёння – гэта ўстанова, якая павінна не толькі захоўваць, знаёміць, але і выхоўваць, навучаць, прывіваць інтарэс і высокі эстэтычны густ да той альбо іншай культурна-гітарычнай з'явы нашага грамадскага жыцця. Новым кірункам дзейнасці музеяў Беларусі павінна стаць распрацоўка педагагічных праграм па этнакультурным выхаванні. Бо менавіта стварэнне адзінага культурнага, інфармацыйнага і адукацыйнага асяродку і з'яўляецца асноўнай умовай для магчымай этнічнай ідэнтыфікацыі насельніцтва. Этнакультурная ідэнтычнасць усталёўваецца ў выніку вывучэння сваёй гісторыі, культуры, павагі да духоўных каштоўнасцяў і традыцый народа, развіцця мовы, захавання культурнай самабытнасці. Аб чым неаднаразова зазначалі вядучыя этнапедагогі краіны. Нам падаецца магчымым стварэнне сродкамі музея адзінай сацыякультурнай сферы, у якой арганічна спалучалася б адукацыйна-выхаваўчая дзейнасць інстытутаў краіны (сярод іх: сям'я, дашкольныя, школьныя, і сярэднеспецыяльныя вучэбныя ўстановы, нацыянальна-культурныя цэнтры, навукова-даследчыя і адміністрацыйныя ўстановы). Дзякуючы такому комплекснаму ўзаемадзеянню бачыцца магчымым паўнаякаснае, усебаковае выхаванне і адукацыя дзяцей і моладзі. Аб'ядноўваючым прыярытэтным накірункам дзейнасці такога новаўтварэння можа з поспехам стаць, як нам бачыцца, вывучэнне і захаванне комплекса нашай традыцыйнай культуры, у прыватнасці, нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі.

Да гэтага імкнуцца (вызначылася такая тэндэнцыя ў развіцці музейнай спарвы ў Беларусі) як этнаграфічныя, так і краязнаўчыя, у дастатковай ступені літаратурныя, і крыху мастацкія музеі Беларусі. Асноўным напрамкам іх дзейнасці стала вырашэнне агульнай канцэптуальнай мэты – захавання і трансляцыі ў часе і прасторы беларускай культурнай традыцыі праз наладжванне фальклорна-этнаграфічных экспазіцый, выстаў, правядзенне фальклорных святаў, заняткаў і лекцый, прысвечаных этнакультурнай праблематыцы. Музей у сваёй дзейнасці карыстаецца ўсімі сродкамі сацыяльнай мовы

(вербальны, невербальны, знакава-сімвальны), якая ў сваю чаргу і фарміруе, і даводзіць культурныя нормы і каштоўнасці [6, с. 80]. Для кожнага этнасу гэта будзе свая сацыяльная мова, якая фарміравалася на працягу гістарычнага развіцця, увабраўшы ў сябе і ўвесь выхаваўчы вопыт народа таксама. Менавіта таму выхаваўчы працэс у музеі па сродках сацыяльнай мовы – з'ява актуальная і неабходная на сённяшні дзень. Гэта актуальнасць пацвярджаецца яшчэ і тымі абставінамі, што фрагменты сацыяльных моў мінулых стагоддзяў – у народных рамёствах, паданнях і песнях, святах і, безумоўна, прадметах з побыту народа – існуюць і сёння. І менавіта музею па сіле зрабіць іх «дасціпнымі» для ўспрымання, «прачытання» наведвальнікамі.

Такім чынам, сучасны музей і ёсць адна з тых устаноў, якая здольныя наладзіць этнавыхаваўчы і адукацыйны працэс шляхам рэпрэзентацыі народнай, каранёвай культурнай традыцыі з мэтай наладжвання яе перадачы ад пакалення да пакалення сродкамі сацыяльнай мовы (а менавіта сацыяльных моў мінулых стагоддзяў). У агульным значэнні такога кшталту дзейнасць з'яўляецца інавацыйным спалучэннем этнапедагогікі і музейнай камунікацыі.

Спіс літаратуры:

1. Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь : Закон РБ // База дадзеных «Консультант плюс» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://www.consultant_plus.by. – Дата доступа : 19. 02. 2008.
2. Штудыі Рэспубліканскай сезоннай фальклорнай школы / уклад. В.В. Калацэй ; рэд. кал. В.В.Калацэй (адк. рэд.) [і інш]. – Мінск : БДУ культуры і мастацтваў, 2007. – 72 с. : іл.
3. Калбаска, А. Заслаўскі музей-запаведнік як спроба рэалізацыі ідэй новай музеялогіі / А. Калбаска // Аператыўн. інфарм. па прабл. культуры і мастацтва : зб. арт. / Нац. б-ка Беларусі. – Мінск, 1995. – С. 49–68.
4. Музей і наведвальнік / рэдсавет: З. Шыбека (адказ. рэд.) [і інш]. – Мінск, 1999. – 43 с.
5. Кондратьев, В.В. Свойства музейного предмета и пути его использования / В.В. Кондратьев // Музееведение. Проблемы использования и сохранения музейных ценностей : сб. науч. тр. / НИИ культуры. – М., 1985. – С. 5–12.
6. Воронин, А.А. Музеи как креативное пространство культуры / А.А. Воронин // Философские исследования. – 1994. – № 1. – С. 69–84.

*Уладзімір Зяневіч*

## ПРАБЛЕМЫ ВЫКАРЫСТАННЯ БЕЛАРУСКАГА ПЕСЕННАГА ФАЛЬКЛОРУ Ў НАВУЧАЛЬНЫМ ПРАЦЭСЕ

Сучаснае грамадства характарызуецца моцнымі і паскоранымі працэсамі глабалізацыі. У характары працякання апошніх выяўляюцца тэндэнцыя, з аднаго боку, да разбурэння натуральнага экакультурнага асяроддзя, страты, ніверліравання і, нават, знікнення адметных рысаў і асаблівасцей, уласцівых асобным этнасам, а з другога боку (як рэакцыя на першую), тэндэнцыя да пошукаў фундаментальных маральна-этычных аснаванняў культуры. На іх падставе падаецца магчымым адраджэнне і засваенне сапраўдных каштоўнасцей нацыянальнай матэрыяльнай і нематэрыяльнай спадчыны, станаўленне духоўных ідэалаў і ўмацаванне нацыянальна-культурнай самасвядомасці.

Традыцыйная мастацкая культура, фальклор Беларусі, як частка нацыянальнай духоўнай спадчыны, з'яўляюцца скарбонкай сацыяльнага досведу нашага народа, праяўленнем унікальнай мастацкай творчасці чалавека, прадыктаванай характэрнымі толькі для культуры народа Беларусі асаблівасцямі ладу яго жыцця. Яны могуць стаць падмуркам у разгортванні працы па экалогіі культуры як часткі сацыяльнай экалогіі сучаснага грамадства. Бо адной з сутнасных характарыстак традыцыйнай культуры з'яўляецца яе здольнасць рэгенерыраваць і інтэграваць у сістэме сучаснай культуры нацыянальна-адметнае ва ўмовах якога толькі і магчыма духоўнае здароўе нацыі. Фальклор ў гэтым аспекце ёсць сувязным элементам, гарантам гістарычнай пераемнасці як аднаго з найважнейшых іманентных законаў развіцця культуры.

Аднак дзяржаўнай аховы і грамадскай увагі патрабуе і сама вусная народная творчасць. У Рэспубліцы Беларусь на заканадаўчым узроўні выпрацавана сістэма «арганізацыйных, прававых, эканамічных, матэрыяльна-тэхнічных, навуковых, інфармацыйных і іншых мер, накіраваных на недапушчэнне